муществ уделяли земельному устройству этой категории сельских обывателей. В это время государственная казна потеряла значительную часть своих владений. С преобразованием палат госимуществ (1867 г.) в управления госимуществами в их ведении остались леса и немногие оброчные статьи, поэтому на рубеже 1870–1880-х гг. количество местных управлений было сокращено. В начале XX в. в рамках реформирования ведомства госимуществ создавались управления земледелия и госимуществ, в состав которых включались новые специализированные должности по отраслям лесного и сельского хозяйства.

*Литература и источники*


1. Историческое обозрение пятидесятилетней деятельности Министерства государственных имуществ. 1837–1887. В 5 ч. Ч. 4. Сельское хозяйство. Коннозаводство / под ред. В.И. Вешнякова. – СПб.: Тип. Киршбаума, 1888. – 468 с.
2. Полный собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). – 2-е собр. – Т. 14. – Отд. 1. – № 13035.
3. Краткий обзор деятельности управления государственными имуществами Виленской и Ковенской губерний с 1837 по 1903 г. – Вильна: Тип. «Русский почин», 1903. – IV, 64 с.
4. Историческое обозрение пятидесятилетней деятельности Министерства государственных имуществ. 1837–1887. В 5 ч. Ч. 2. Попечительство. Поземельное устройство. – СПб.: Тип. Я.И. Либермана, 1888. – 547 с.
5. Историческое обозрение пятидесятилетней деятельности Министерства государственных имуществ. 1837–1887. В 5 ч. Ч. 3. Государственные имущества. – СПб.: Тип. В. Безрукова и Ко, 1888. – 452 с.
6. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 42. – Отд. 1. – № 44590.
7. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 41. – Отд. 2. – № 44024.
8. Национальный исторический архив Беларуси в г. Минске (НИАБ). – Фонд 1595. – Оп. 1. – Д. 1. Журналы Минского губернского присутствия по отделению продовольственному (1901–1902).
9. Российский государственный исторический архив в г. Санкт-Петербурге (РГИА). – Фонд 1263. – Оп. 4. – Д. 46. Отчет Виленского, Ковенского и Гродненского генерал-губернатора за 1868, 1869 и 1870 г.
10. РГИА. – Фонд 1284. – Оп. 223. – 1884 г. – Д. 95. Дело со всеподданнейшим отчетом о состоянии Гродненской губернии за 1883 г.
11. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 51. – Отд. 2. – № 56769.
12. Историческое обозрение пятидесятилетней деятельности Министерства государственных имуществ. 1837–1887. В 5 ч. Ч. 1. Учреждение и преобразования Министерства. – СПб.: Паровая скоропечатня Яблонский и Перотт, 1888. – [2], IX, 103, LXIV, [1].
13. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 8. – № 5120.
14. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 22. – Отд. 1. – № 21694.
15. Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917) / сост. Т.Е. Леонтьева. – Минск: БелНИИДАД, 2006. – 416 с.
16. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 26. – Отд. 1. – № 27478.
17. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 31. – Отд. 1. – № 35370.



*Summary*

*The article analyzes the state property management system in Belarus at the end of XVIII – beginning XXth century. The changes of the reform competence and reasons of local institutions and ministery system are pointed out. It was indicated that the local State Property has a broader functions than similar establishments in the interior provinces of the Russian Empire. They were engaged in providing multiple categories of rural inhabitants, Orthodox clergy, parish schools and churches with land and forest materials. They managed the confiscated property of the participants of the revolts of 1863–1864 and 1830–1831. Bodies of State Property solved important social-economic and political problems in the region.*


Поступила в редакцию 05.02.2014 г.

*УДК 94(476)«1906/1914»:332.3*

***К.Ю. Тарановіч,***
*аспірант кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ*

# ДЗЕЙНАСЦЬ ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАЛЬНЫХ КАМІСІЙ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ ЗЯМЕЛЬНАЙ УЛАСНАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ (1906–1914 гг.)

Праблемы гісторыі Расійскай імперыі пачатку XX ст. заўсёды выклікалі павышаную цікавасць з боку даследчыкаў. Гэта тлумачыцца тым, што менавіта ў адзначаны перыяд адбывалася ўсталяванне новых элементаў у палітычнай і эканамічнай структурах краіны, куды таксама ўваходзілі беларускія землі. Ход гістарычных падзей прывёў не толькі да карэнных змен у сістэме дзяржаўнага кіравання і гаспадарчых адносін, але і ў фарміраванні гістарычнай супольнасці. Крушэнне традыцыйных форм арганізацыі кіравання і ўкараненне новага парадку грамадскага ўзаемадзеяння вывелі Расійскую імперыю на больш высокі эканамічны ўзровень.

Для большай часткі насельніцтва краіны зямля з'яўлялася галоўным сродкам вытворчасці, а таксама фактарам, які вызначаў гаспадарчы дабрабыт усёй дзяржавы. Царскі ўрад добра разумеў, што без правільнага вырашэння пытання аб землеўладанні і зямельных парадках немагчыма палепшыць становішча земляробчага насельніцтва, а таксама прадухіліць нарастаючае рэвалюцыйнае ўзрушэнне.

Найбольш эфектыўным сродкам вырашэння актуальных сялянскіх пытанняў урад лічыў змену пазямельных адносін, гэта значыць замацаванне за сялянамі зямлі ў іх асабістую ўласнасць. Гэта павінна было пакласці канец аграрным хваляванням, якія лічыліся галоўнымі і самымі небяспечнымі крыніцамі смут у краіне. Меркавалася, што дробныя зямельныя ўласнікі стануць больш прывязанымі да зямлі і ў любых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сітуацыях будуць абараняць свае зямельныя інтарэсы, сваю зямельную ўласнасць.

Рашэнне аграрнага пытання выклікала аб'ектыўную неабходнасць у пераразмеркаванні наяўнай у гаспадарчым абароце зямельнай уласнасці. У сувязі з гэтым у Расійскай імперыі паскорыўся працэс мабілізацыі, гэта значыць свабодны пераход з рук у рукі зямельнай нерухомасці.

Прагрэсіўны ўплыў мабілізацыйных працэсаў на гаспадарчую дзейнасць тлумачыцца некалькімі прычынамі. Так, пры свабодзе валодання, зямля трапляе ў рукі найбольш зацікаўленых і, выходзячы з саслоўя, прыстасоўваецца да сацыяльных груп, гэта значыць становіцца аб'ектам гаспадарчай дзейнасці людзей, здольных арганізаваць прадуктыўную гаспадарку. Дзякуючы мабілізацыі ўзрастае колькасць землеўладальнікаў, што павялічвае працэнт занятага ў сельскай гаспадарцы насельніцтва. У такім выпадку ўмацоўваецца народная гаспадарка ў цэлым.

Механізмам рэалізацыі працэсу пераразмеркавання зямлі з'яўляліся землеўпарадкавальныя камісіі, створаныя паводле ўказа Мікалая II ад 4 сакавіка 1906 г. [14]. Па сутнасці на камісіі ўскладалася практычнае ажыццяўленне мабілізацыі зямельнай уласнасці, сутнасць і вынікі якой на беларускіх землях з'яўляюцца *мэтай* нашага *даследавання*.

Характарызуючы ў цэлым ступень даследавання вылучанай тэмы, неабходна адзначыць, што дзейнасць землеўпарадкавальных камісій у Беларусі не з'яўлялася прадметам спецыяльнага вывучэння ў айчыннай гістарыяграфіі. У гістарычнай літаратуры акцэнт рабіўся на вывучэнне мэт, задач, напрамкаў і вынікаў Сталыпінскай рэформы, у межах якой дзейнічалі камісіі. Аднак дзяржаўныя структуры, якія ажыццяўлялі рэформу на практыцы, не знайшлі адлюстраванне ў навуковых працах.

У 20–30-я гг. ХХ ст. у беларускай гістарыяграфіі быў пакладзены пачатак вывучэнню змяненняў у аграрных адносінах, выкліканых Сталыпінскай рэформай. У гэты перыяд выходзяць працы І.Д. Шулейкіна [18], Д.А. Дудкова [2], К.І. Кернажыцкага [4]. Аднак даследаванні аўтараў характарызуюцца вузкасцю крыніц і абсалютызацыяй партыйна-класавага падыходу.

Вывучэнне пытанняў рэфармавання зямельных адносін працягвалася ў 50–80-я гг. ХХ ст. Разглядаемая праблема часткова закранался ў працах Э.Ф. Хромавай [16], І.І. Саладкова [15], Л.П. Ліпінскага [6], дысертацыі А.В. Шапкарына [17].

Новыя тэндэнцыі ў вывучэнні актуальных пытанняў аграрнай гісторыі Беларусі ўзніклі ў пачатку 90-х гг. Беларускія даследчыкі прыступілі да вывучэння розных аспектаў Сталыпінскай рэформы з улікам дасягненняў сучаснай метадалогіі гістарычнай навукі. Дадзеным праблемам прысвечаны працы А.П. Купчынавай [5], В.П. Панюціча [13] і інш. Даследаванні аўтараў змястоўныя, высновы абгрунтаваныя. Аднак, разглядаючы вынікі і асаблівасці рэформы, гісторыкі выпусцілі з поля зроку дзяржаўныя механізмы практычнага ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў.

Адсутнасць комплекснага даследавання, асвятляючага ўрадавыя рычагі рэфармавання, выклікае неабходнасць зноў звярнуцца да гэтай праблемы і прааналізаваць яе праз працэс стварэння і дзейнасці землеўпарадкавальных камісій.

Дзейнасць камісій па мабілізацыі зямельнай уласнасці ажыццяўлялася па наступных кірунках: 1) садзейнічанне сялянам пры пакупцы зямлі, якая знаходзілася ў распараджэнні Сялянскага банка, 2) арганізацыя аперацый па продажы казённых зямель земляробчаму насельніцтву, 3) уцягванне ў арэнду казённых зямель, якія не былі прададзены сялянам [7, л. 9].

Царскі ўрад да 1906 г. устанавіў для сялян шэраг льгот і пераваг у арэндзе казённых зямель у параўнанні з арандатарамі іншых саслоўяў. Іх сутнасць зводзілася да прадастаўлення сялянскім таварыствам і селішчам права арандаваць казённыя аброчная надзелы без таргоў пры ўмове выплаты аброку мірскімі прысудамі і ўзаемных зарук замест прадастаўлення грашовых закладаў, якія патрабавалі ад арандатараў іншых саслоўных груп [3, с. 51].

Буйныя памеры чыншавых надзелаў і аддаленасць іх ад месцажыхарства сялян, якія мелі патрэбу ў зямлі, з'яўляліся істотнай перашкодай пры прымяненні ўстаноўленых ільгот, таму казённыя землі ў большасці выпадкаў аказваліся ў руках шматлікіх таварыстваў сялян і сельскіх абшчын. У многіх выпадках назіралася, што таварыствы сялян, арандуючы буйны аброчны надзел, размяркоўвалі яго паміж сабой прапарцыянальна колькасці надзельнай зямлі, якая ўжо знаходзілася ва ўласнасці асобных сялян, з прычыны чаго арандуемая казённая зямля аказвалася ў валоданні тых, хто ўжо меў дастатковую колькасць зямельнага ўладання. Малазямельныя і беззямельныя сяляне часта аказваліся або зусім без зямлі, або з малымі ўчасткамі [3, с. 52].

У сувязі з такім становішчам землеўпарадкавальным камісіям указам 27 жніўня 1906 г. былі прадастаўлены паўнамоцтвы па распараджэнні разбіўкай значных па плошчы казённых зямель на больш дробныя ўчасткі для здачы ў арэнду асобным сялянам і дробным таварыствам. У мэтах укаранення ў сялянскае асяроддзе палепшаных прыёмаў паляводства, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

забяспечвалі найбольшую прадукцыйнасць зямлі, камісіям было даручана змяняць у неабходных выпадках існаваўшыя на надзелах севазвароты і праводзіць меліярацыю [3, с. 53].

Мабілізацыя зямельнай уласнасці ў губернях уяўляла сабой паэтапны працэс, які патрабаваў падрыхтоўчай стадыі. На пачатковым этапе землеўпарадкавальныя камісіі праводзілі працу па зборы і сістэматызацыі неабходных статыстычных даных аб становішчы землеўладання ў кожным павеце [8, л. 3–5] .

Атрымаўшы інфармацыю аб памеры зямельнага забеспячэння асобных двароў, землеўпарадкавальныя камісіі вызначалі сярэдні існуючы памер участка па павеце або асобным раёне. Гэтыя аперацыі здзяйсняліся з той мэтай, каб выявіць колькасць гаспадарак, зямельнае забеспячэнне якіх было меншым за сярэднестатыстычную велічыню, і ў далейшым у першую чаргу ім аказвалася дапамога пры куплі зямлі і паляпшэнні ўмоў землекарыстання [8, л. 6].

Высвятляючы зямельнае становішча сялянскага насельніцтва ў асобнасці, землеўпарадкавальныя камісіі таксама вызначалі мэты размеркавання зямельнай уласнасці ў кожным павеце ў агульным па наступнай схеме: 1) колькасць казённых і ўдзельных зямель, якія ўжо былі арандаваны сялянамі, а таксама колькасць астатняй зямлі, прыдатнай для сельскагаспадарчага выкарыстання, 2) колькасць зямлі, якая яшчэ не здавалася, але планавалася для здачы ў арэнду сялянам прыватнаўласніцкіх гаспадарак, а таксама колькасць угоддзяў, якія прыносілі мясцоваму насельніцтву пастаянныя грашовыя заробкі [9, л. 11]. Такім чынам, камісіі атрымлівалі інфармацыю адносна рацыянальнасці выкарыстання ў гаспадарчым абароце зямлі ў кожным павеце і вызначалі зямельнае становішча асобных сялянскіх двароў.

У першыя гады сваёй дзейнасці землеўпарадкавальныя камісіі прымалі непасрэдны ўдзел у складанні праектаў продажу маёнткаў, набытых Сялянскім пазямельным банкам. У далейшым гэтыя мерапрыемствы праводзіліся мясцовымі ліквідацыйнымі аддзеламі пры аддзяленнях банка пры дапамозе межавых тэхнікаў, камандзіраваных са складу землеўпарадкавальных камісій. Самі ж камісіі ўдзельнічалі толькі ў разглядзе ліквідацыйных праектаў, выпрацаваных банкам, а таксама ўсталёўвалі спіс сялян-пакупнікоў [3, с. 5].

Сялянскі пазямельны банк выконваў важную ролю ў рэгуляванні попыту і прапаноў на рынку зямлі ў 1905–1907 гг. Пасля 9 лістапада 1906 г. уся яго дзейнасць была накіравана на садзейнічанне ў правядзенні зямельнай рэформы. Супрацоўніцтва Сялянскага банка і землеўпарадкавальных камісій у Беларусі прывяло да павелічэння колькасці сялян, якія жадалі набыць дадатковыя плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў: калі з 1893 па 1906 г. у 5 паўночна-заходніх губернях (Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай) было пададзена 1 тыс. 204 заявы аб набыцці зямельнай нерухомасці, то толькі за 1907 г. – 3 тыс. 260 (з іх 1 тыс. 916 атрымалі дазвол) [1, с. 60–61].

Такое рэзкае павелічэнне попыту на зямлю было звязана з тым, што кошт на яе ў беларускім рэгіёне быў адным з самых нізкіх па Расійскай імперыі – 54 руб. за 1 дзес. (у іншых – 60–80 руб.). Акрамя гэтага, колькасць зямлі, набытай праз Сялянскі банк у 5 паўночна-заходніх губернях, складала 12–15 дзес. на двор, у той час як у цэнтральных губернях дазвалялася набываць у сярэднім 9–10 дзес. на двор [1, с. 77].

Асноўнымі прадаўцамі зямлі выступалі дваране. У Мінскай, Гродзенскай, Віленскай і Віцебскай губернях пераважала купля зямлі ў аднаасобную ўласнасць, што было выгадна па дзвюх прычынах: па-першае, для аднаасобнікаў кошт зямлі быў ніжэйшы, чым для таварыстваў, па-другое, аднаасобнікам дазвалялася выдача пазык часцей, чым аб'яднанням. Таму колькасць выдадзеных пазык у 5 паўночна-заходніх губернях прыкметна павялічылася: у 1905 г. – 2 тыс. 924 пазыкі на суму 318 тыс. 679 руб., а ў 1907 г. – 4 тыс. 130 на суму 752 тыс. 701 руб. [1, с. 78].

Пры куплі зямлі ў банка сяляне атрымлівалі пазыкі пад нязначныя працэнты тэрмінам на 55 гадоў. Сялянскі пазямельны банк крэдытаваў таксама перасяленне сялян на набытыя ў банка землі. У 1907–1909 гг. у 5 паўночна-заходніх губернях пры садзейнічанні землеўпарадкавальных камісій сяляне набылі 183 тыс. 310 дзес. зямлі, у 1910–1912 гг. – 313 тыс. 549 дзес. зямлі. Усяго па рэгіёне з 1907 па 1915 г. сялянамі было куплена 770 тыс. 100 дзес. зямлі. Размеркаванне набытай зямлі выглядала наступным чынам: у прыватнае валоданне – 91 % , таварыствы – 6,7 %, сельскія абшчыны – 2,4 %. Пры гэтым амаль уся прададзеная зямля адводзілася пад арганізацыю хутарскіх і адрубных гаспадарак [1, с. 80].

Важным аспектам дзейнасці землеўпарадкавальных камісій з'яўляўся продаж сялянскаму насельніцтву казённай зямельнай уласнасці [10]. Ён праводзіўся з мэтай распаўсюджвання трывалых і эфектыўных сялянскіх гаспадарак, таму землеўпарадкавальныя камісіі звярталі ўвагу на зручнасць размяшчэння і гаспадарчую неабходнасць у набываемым участку для пакупніка [7, л. 5].

Камісіі вызначалі плошчу і кошт прадаваемай зямлі. Як правіла, пакупнікі ўносілі задатак, які складаў не менш чым 5 % кошту. Але ў тых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выпадках, калі селянін перасяляўся на набыты ім участак, землеўпарадкавальныя камісіі папярэдне паніжалі памер задатку, а ў некаторых выпадках нават вызвалялі ад яго [7, л. 6].

Так, да 1911 г. у 5 паўночна-заходніх губернях пры садзейнічанні землеўпарадкавальных камісій 2 тыс. 981 сялянскіх гаспадарак набылі 4 тыс. 654 дзес. Усяго да 1914 г. землеўпарадкавальнымі камісіямі было прададзена 29 тыс. 236 дзес. казённых зямель. У сярэднім сяляне набывалі ад 10 да 12 дзес. на двор [12].

Пераважным кантынгентам пакупнікоў казённай зямлі ў аднаасобнае валоданне былі, як правіла, беззямельныя і малазямельныя гаспадаркі. Што ж тычыцца абшчынных і таварыскіх здзелак, то яны складаліся пераважна для ліквідацыі цераспалосіцы, незалежна ад зямельнага забеспячэння пакупніка [3, с. 62].

Мабілізацыя зямельнай уласнасці ажыццяўлялася таксама за кошт арганізацыі землеўпарадкавальнымі камісіямі арэнды казённай зямлі. Пры здачы ў арэнду зямельнай уласнасці на землеўпарадкавальныя камісіі ўскладаліся абавязкі па разглядзе ўсіх хадайніцтваў аб прадастаўленні зямлі і вызначэнні ўмоў арэнды, падборы арандатараў і задавальненні просьб аб прадастаўленні льгот [11].

Да 1911 г. 4058 сялянскімі дварамі было арандавана 12 тыс. 931 дзес. казённай зямлі, што ў сярэднім складала па 3 дзес. на двор [12].

Такім чынам, у выніку мабілізацыйнай дзейнасці землеўпарадкавальных камісій з 1906 па 1914 г. колькасць зямельнага фонду, які паступіў ва ўладанне сялянскага насельніцтва, павялічылася на 1 млн 41 тыс. 128 дзес., іншымі словамі, на 10,5 % за кошт продажу маёнткаў Сялянскага пазямельнага банка, продажу і арэнды казённых зямель. Калі ў 1905 г. сялянам належала 43,6 % усёй зямельнай уласнасці, то ў 1914 г. гэты паказчык склаў 54,1 % ад агульнай колькасці зямлі ў рэгіёне. Гэта сведчыць аб тым, што больш за палову ўсіх зямель у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях перайшлі ў рукі той часткі насельніцтва, якая ў найбольшай ступені мела патрэбу ў ёй.

Дзейнасць землеўпарадкавальных камісій па мабілізацыі зямельнай уласнасці прывяла да павелічэння плошчы зямлі, якая належала сялянскаму насельніцтву ў 5 паўночна-заходніх губернях. У выніку ў рэгіёне адбылося пераразмеркаванне зямельнага фонду. Пры актыўным удзеле землеўпарадкавальных камісій зямля паступала ў рукі тых уладальнікаў, якія імкнуліся да стварэння эфектыўных прыватнаўласніцкіх гаспадарак. Змена гаспадарчых адносін паўплывала на гаспадарчую структуру Расійскай імперыі ў цэлым і беларускіх тэрыторый у прыватнасці. Па гэтай прычыне магчыма сцвярджаць, што дзейнасць землеўпарадкавальных камісій па мабілізацыі зямельнай уласнасці ў Беларусі з'яўлялася важным практычным аспектам правядзення Сталыпінскай рэформы і істотным механізмам урада, які намагаўся стрымліваць сацыяльна-эканамічныя супярэчнасці ў імперыі ў пачатку XX ст.

*Літаратура і крыніцы*


1. *Дроздова, Е.А.* Формирование банковской системы Беларуси (1861–1914 гг.): монография / Е.А. Дроздова. – Минск: Ковчег, 2007. – 164 с.
2. *Дудкоў, Д.А.* Сталыпінская рэформа ў Віцебскай губерні / Д.А. Дудкоў. – Мінск: Беларус. акад. навук, 1931. – 121 с.
3. Землеустройство (1907–1910 гг.): обзор деятельности землеустроительных комиссий со времени их открытия по 1 января 1911 года / Главное упр. землеустройства и земледелия, Департамент гос. земельных имуществ. – СПб.: Тип. В.Ф. Киршбаума, 1911 г. – 120 с.
4. *Кернажыцкі, К.І.* Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной / К.І. Кернажыцкі. – Мінск: Бел. акад. навук, 1932. – 102 с.
5. *Купчинова, А.П.* Столыпинская аграрная реформа: лекция / А.П. Купчинова / Белорусская государственная сельскохозяйственная академия. – Горки: БГСХА, 2001. – 40 с.
6. *Липинский, Л.П.* Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии / Л.П. Липинский. – Минск: Изд-во БГУ, 1978. – 221 с.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінске (далей – НГАБ). – Фонд 2611. – Воп. 1. – Спр. 1. Циркуляр об утверждении комиссий. За 1907 г.
8. НГАБ. – Фонд 47. – Воп. 5. – Спр. 8. Деятельность комиссий по улучшению условий землепользования. За 1908 г.
9. НГАБ. – Фонд 47. – Воп. 1. – Спр. 1. Об учреждении землеустроительных комиссий. За 1906 г.
10. НГАБ. – Фонд 47. – Воп. 5. – Спр. 24. Сведения о ликвидации казенных земель. За 1909 г.
11. НГАБ. – Фонд 47. – Воп. 1. – Спр. 390. О сдаче в аренду казенных земель. За 1909 г.
12. Отчетные сведения о деятельности землеустроительных комиссий на 1 января 1916 года / Глав. упр. землеустройства и земледелия. Деп. гос. земельных имуществ. – СПб.: Тип. В.О. Кишбаума, 1916 – 29 с.
13. *Панютич, В.П.* Историография аграрной истории Беларуси, 1861–1917 / В.П. Панютич. – Минск: Институт истории НАН Беларуси, 2005. – 260 с.
14. Полное собрание законов Российской империи. Т. 26. – СПб., 1909. – 1141 с. – № 27 478. – С. 199–201.
15. *Саладков, И.И.* Социально-экономическое положение Белоруссии до Великой Октябрьской социалистической революции: конец XIX – нач. XX в. / И.И. Солодков. – Минск: Изд-во Белгосуниверситета, 1957. – 161 с.
16. *Хромова, Э.Ф.* Крестьянское движение в Витебской губернии в 1907–1909 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук / Э.Ф. Хромова. – Минск: Белорус. гос. ун-т им. В.И. Ленина, 1954. – 19 с.
17. *Шапкарин, А.В.* Столыпинская аграрная реформа: автореф. дис. ... д-ра ист. наук / А.В. Шапкарин. – М.: Акад. наук СССР, 1954. – 48 с.
18. *Шулейкин, И.Д.* История земельных отношений. Столыпинская реформа и землеустройство / И.Д. Шулейкин. – Ленинград: Гос. из-во сельскохоз. лит-ры, 1931. – 48 с.



*Summary*

*The articles reveals the land exploitation commissions for land property redistribution in favour of peasant population during Stolypin's agrarian reform. The article outlines the commissions' paticipating in buying up the estates of the Peasant Land Bank, selling and leasing of state lands. It is proved that the land exploitation on commissions were the main means of solving agrarian problems for the tsarist government in Russian Empire in the beginning of the XX$^{th}$ century.*


Паступіў у рэдакцыю 18.12.2013 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ